*Ігар Кузьмініч*



# Казачка
# пра гандляра Пятра, Казу і Каляды

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
К89

Ілюстрацыі *Алесі Галоты*

ISBN 978-985-02-1620-5
© Кузьмініч І. Р., 2014
© Афармленне. УП «Мастацкая літаратура», 2014



Гэтая казачка пра часы даўныя-старадаўныя. Было гэта так даўно, што ніхто і не памятае калі. А казачку гэтую мне апавяла сама Каза на мінулыя Каляды.

Жыла ў тыя даўныя часы Каза – залатыя рожкі, тоненькія ножкі, мяккая паўсцінка ды шэрая спінка.

Нястомная яна была. Штодня раненька ўставала, сонца клікала ды па зямлі нашай скакала. А там, дзе Каза ходзіць – жыццё родзіць, дзе Каза нагой – там бульба капой, дзе Каза рогам – там жыта стогам, да чаго Каза дакранаецца – тое абуджаецца.

З рана і да познай ночы скакала наша Козачка, жыццё памнажаючы. Ужо і сонейка стоміцца ды кажа да яе:

– Козачка мая, Козачка, пойдзем спаць, стамілася я.

А Каза сонейку ў адказ:

– Так, так, пойдзем. Адно заскочу ў садок, каб яблычкі ўрадзілі.

– Ну,– пытаецца сонейка,– цяпер усё?

– Але, але! Толькі на рэчку зазірну, каб рыбкам чаго есці было.



Таму даўней і дні доўгія былі, і ночкі кароценькія. Толькі ляжаш спаць, а ўжо ранак. З таго і цёпла на нашай зямлі было – цэлую пару ўсё лета і лета. А зямля радзіла – нават параўнаць няма з чым: жыта, як гай шумела, бульба, як гарбузы ляжала,

а гарбузы, як дом раслі, рыбы ў рэчцы вялося – вяслом не зварухнеш, а звярыны ў лесе – за кожным дрэвам па дзіку ці ласю, мёду, як гліны, збожжа, як снегу, дабро само ракою цякло!

І жыў у тыя часы Пятро. Слаўны быў гаспадар. Гандлем займаўся. Добра ўмеў гандляваць, бо перакanaць мог каго хочаш. Добра ўмеў гаварыць. І не толькі па-беларуску, але і на чужых мовах спраўна балакаў. І ўсё ў Пятра было добра: і здароўе, і каханне, і гаспадарка. Заможны ён быў, але пра грамаду сваю не забываўся. Трацiну ўсіх заробкаў на тое, каб ладзіць дарогі, масты ці на іншыя супольныя патрэбы аддаваў, а другую трацiну – на нямоглых, якія самыя зарабіць не маглі. Ведаў ён, што талент яму дадзены



так складна прамаўляць, каб людзей радаваць, карысць ім прыносячы, а не тое, каб грошы выцягваць ці сябе напаказ выстаўляць. За гэта не толькі багацце меў гандляр Пятро, але і павагу кожнага.

Ды была адна бяда ў Пятра: не было ў іх з жонкай дзетак. А дзяцей Пятро любіў і бедаваў з таго, што іх не мае.

І надумаў Пятро да сябе ў хату Казу запрасіць, каб яна ў сям'ю дзетак і шчасце прынесла.

Сустрэў раз Пятро Казу дый кажа:

– Чуў я, што ты шчасце ў дом прыносіш. Зайдзі, пасядзі ў нас на ўслоне! Зачакаліся мы з жонкай дзетак малых.

– А што? – кажа Каза.– Чалавек ты добры, прыстойны. Чаму б і не пасядзець? Адчыняй хату!

Зайшлі яны ў хату, а Пятро Казе:

– Можа, квасу вып'еш з дарогі?

– Добра! Квасу вып'ю і адразу пайду, бо шмат яшчэ спраў маю, не магу затрымацца,– адказвае Каза.

Наліў Пятро квасу ды пытаецца:

– Дык, можа, ты чаго з'ясі? Мая жонка добрую куццю з мёдам гатуе.

– Добра! – пагадзілася Каза. – Куццю я ніколі не ела, то пакаштую.

Паставілі куццю перад Казой, а Пятро байкі ёй бае пра жыццё, пра свет, дзе што бачыў, чаго пачуў, дзе бываў. А Каза заслухалася дый забылася, што трэба ісці ёй. Зусім загаварыў Пятро госцейку. Сядзіць Каза, Пятра слухае ды куццю есць. А як толькі даядае, жонка новай куцці лыжку падкладае.

Так і засталася Каза ў Пятра ў хаце.



Сонца бачыць – няма Казы, дый пайшло да сябе спаць.

Не стала каму сонца падганяць, таму дні сталі кароткія, а ночкі доўгія.

З таго, што Каза не хадзіла, не скакала па лясох і гародах, трава пачала жоўкнуць, лісце ападаць. І



прыйшла на зямлю восень, а за ёй і зіма. Халодна стала, і замест дажджу снег пайшоў.

Дзіўна ўсё гэта было людзям бачыць, бо ніколі яшчэ на Зямлі зімы не было. Раней толькі лета і ведалі людзі.

Пачалі людзі збірацца ды раду радзіць, што ім рабіць далей і як ім Казу шукаць, каб яна лета вярнула.

Апрануліся людзі ў кажухі, як тая Каза, зрабілі зорку нашу беларускую васьміканцовую замест сонца і пайшлі па хатах шукаць, дзе Каза спынілася, каб хоць пацешыць яе, калі яна стамілася.

З хаты ў хату ходзяць, Каляду водзяць, Казу шукаюць, у людзей пытаюць. Да кожнага, як зойдуць, то людзі дзякуюць, што яны Казу шукаюць, падарункі розныя даюць.

І прыйшлі калядоўнікі да Пятра, а ён з Казой пры стале сядзіць, байкі ёй бае, а жонка Казе куццю падкладае. У хаце Дастатак і Шчасце разам з імі пры стале сядзяць, куццю ядуць, Пятра слухаюць.

Зайшлі людзі, толькі пачалі казаць, а Пятро ім:

– Добры дзень вам, госцейкі! А што вы так прыйшлі ці Казу нашую павесяліць? Бачыце, Каза стамілася. Можа, распацешыце як? Давайце песню Казе на славу разам запяем!

– Го-го-го каза, го-го-го шэра...– панеслася па хаце.

Бачыць Пятро, спадабалася Казе песня, зараз будзе выходзіць з хаты.

Тады Пятро кажа:

– Дзякуй вам, людзі, што прыйшлі да нас у хату. Каза ў мяне гасцюе, таму дастатку і шчасця праз меру маю, то я з вамі і пажыткам, і шчасцем падзялюся. Даставайце свой мех!

І аддаў Пятро людзям трацiну шчасця і дабра.

Усцешыліся калядоўнікі і пайшлі па хатах.

А Каза кажа:

– Не пашкадаваў ты шчасця людзям. Добры ты гаспадар, то яшчэ ў цябе пасяджу.

І яшчэ Каза засталася, пакуль дзеткі малыя не паз'яўляліся. А як нарадзіліся ў Пятра з жонкай дзеткі – дзве дачкі і два малюпахі-сыночкі,– развіталася Каза з Пятром і пайшла іншым людзям шчасце і дабрабыт несці.

Каб Каза прыходзіла, ставяць людзі на Каляды куццю, бо вельмі Каза куццю з мёдам любіць. А як завітае Каза да каго ў госці ды пабачыць, што не дзеліцца гаспадар сваім шчасцем з людзьмі, пакрыўдавацъ і адысці можа. Таму і стараюцца ўсе, як могуць, дагадзіць

Казе і калядоўнікам, каб шчасце ў іх хаце затрымалася.





*Літаратурна-мастацкае выданне*

**КУЗЬМІНІЧ Ігар Расціслававіч**

КАЗАЧКА ПРА ГАНДЛЯРА ПЯТРА,
КАЗУ І КАЛЯДЫ

Для чытання дарослымі дзецям

Рэдактар А. В. Спрынчан
Мастацкі рэдактар В. А. Макаранка
Тэхнічны рэдактар Л. І. Астрэйка
Стылістычны рэдактар А. Я. Чарняк

Падпісана да друку 06.05.2014. Фармат 60×90 1/32. Папера мелаваная.
Гарнітура SchoolBookC. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 0,5.
Улік.-выд. арк. 0,45. Тыраж 2500 экз. Заказ 21892

УП «Мастацкая літаратура». ПДРВВРДВ № 1/5 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

UAB «Grafija». Pr. Savanorių 219 a, LT-02300 Vilnius, Lietuva.

Мінск
«Мастацкая
літаратура»
2014

ISBN 978-985-02-1620-5

9 789850 216205

EAC